УДК 811. 111: 004.9

# СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ДЛЯ ПАЗААЎДЫТОРНАЙ ПРАЦЫ ПАДЧАС ВЫВУЧЭННЯ АНГІЙСКАЙ МОВЫ Ў ТЭХНІЧНАЙ ВНУ

Макарыч М.В.

*Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт, Мінск, 2348843@tut.by*

*The article deals with the problem of technical students' independent learning while studying English. Special attention is given to those basic theoretical points and principles, which are necessary for the formation of English lexical grammar skills with the help of modern Internet resources. Their classification and short characteristics are presented.*

*Key words: students' independent learning, lexical grammar skills.*

Сучасны чалавек не ўяўляе сёння свайго жыцця без інтэрнэту. Неабмежаваныя магчымасці па выбару неабходнай інфармацыі атрымлівае любы хто, мае доступ у сеціва. Бясспрэчна, жадаючы знайсці актуальную і кампетэнтную інфармацыю павінен валодаць базавымі ведамі ў той ці іншай галіне. Кампетэнтнасць чалавека дае магчымасць не толькі атрымаць, але і годна выкарыстаць атрыманыя дадзеныя. Асабліва гэта датычыцца студэнтаў тэхнічных ВНУ, якія дзякуючы спецыфіцы навучальных праграм маюць шырокі досвед у пытаннях выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў.

Апошнім часам пытанне аб ужыванні інфармацыйных тэхналогій падчас навучання ў вышэйшай установе набывае актуальнасць, бо найноўшыя тэхнічныя сродкі спрыяюць вылучэнню новых формаў і метадаў выкладання. Выкарыстанне інтэрнэт-тэхналогій дапамагае зрабіць працэс навучання больш асабістым і дазваляе арганізаваць яго з улікам здольнасцяў студынтаў, узроўню іх адукаванасці і асабістых схільнасцяў. Асабліва эфектыўным можа быць выкарыстанне рэсурсаў інтэрнэта падчас вывучэння замежных моваў. Магчымасць мець зносіны ў іншамоўным асяродку пры дапамозе сусветнай сеткі дапамагае студэнту асэнсаваць сапраўдную значнасць вывучаемай мовы. У той жа час інтэрнэт дае шмат магчымасцяў для трэнінгу моўных умельстваў.

Яшчэ адной безумоўнай перавагай інфармацыйных тэхналогій для студэнта з'яўляецца псіхалагічна спрыяльны фактар. Кампьютар заўсёды лаяльны да свайго вучня, ён не лаецца, не крытыкуе, не мае негатыўных каментароў і дазваляе зрабіць працэс набыцця ведаў камфортным. Дарэчы заўсёды можна абраць пасільны ўзровень працы і паслядоўна, у адпаведнасці са сваім асабістым графікам, перайсці да больш складанага ўзроўню. Такім чынам, інтэрнэт дае вялізарныя магчымасці для самастойнай працы студэнтаў падчас вывучэння замежнай мовы.

Праблема арганізацыі пазааўдыторнай працы студэнтаў набыла сёння актуальнасць з-за абмежаванай колькасці гадзін для выпрацоўкі моўных умельстваў падчас практычных заняткаў у ВНУ. Шляхі да пашырэння магчымасцяў самастойнай працы студэнтаў прадстаўлены у сучасных працах беларускіх і замежных навукоўцаў [1, 2, 3, 4]. Вырашэнне азначанай праблемы вымагае разпрацоўкі метадалагічных планаў самастойнай працы адпаведнай дысцыпліны. Праца павінна будавацца такім чынам, каб матываваць студэнта да яе выканання, бо толькі такім чынам можа быць паспяхова дасягнута канчатковая мэта навучальнага працэсу – фарміраванне лексіка-граматычных моўных умельстваў.

Дадзены артыкул прысвечаны абагульненню і сістэматызацыі існуючых інфармацыйных рэсурсаў, якія ўжываюцца падчас пазааўдыторнага вывучэння англійскай мовы з мэтай падрыхтоўкі студэнтаў тэхнічнай ВНУ да прафесійных зносін.

Намі былі разгледжаны безкаштоўныя рэсурсы, якія знаходзяцца ў адкрытым доступе, адпрацаваны і апрабаваны на практычных занятках па англійскай мове на кафедры англійскай мовы №2 Беларускага нацыянальнага тэхнічнага універсітэта. Умоўна дадзеныя рэсурсы могуць быць падзелены на наступныя групы:

- ✓ Інфармацыйныя крыніцы.
- ✓ Сістэмы тэстаў, якія накіраваны на фарміраванне, трэнінг і рэпрадукцыю умельстваў моўнай дзейнасці.
- ✓ Тэхналогіі, якія прызначаны для спрашчэння працэса засваення іншамоўнай лексікі.
- ✓ Рэсурсы для фарміравання ўмельстваў маўленчай дзейнасці

Падчас вывучэння замежнай мовы студэнту патрэбна шмат дадатковай інфармацыі. Атрымліваць яе прасцей на разнастайных сайтах інтэрнэта, дзе сёння існуе вялікая база аб’ектаў для падрыхтоўкі выступаў, дакладаў, справаздач і прэзентацый. Ёсць магчымасць аператыўна атрымаць дадатковую энцыклапедычную ды краязнаўчую інфармацыю, азнаёміцца з маўленчым этыкетам і асаблівасцямі моўных паводзін розных народаў. Надзейнымі інфармацыйнымі даведнікамі можна лічыць Yahoo!, Galaxy, LookSmart, InfoSeek; пошукавыя сістэмы Alta Vista, HotBob, Open Text, WebCrawler, Excite.

Напрыклад сайты http://www.britannica.com/ і http://www.britishcouncil.org/ прадстаўляюць вялікую колькасць навінаў Брытанскага савета адносна сусветных падзей. Тут студэнты знойдуць даведкі пра навучальнаны працэс у англамоўных краінах. Сайт www.uk.ru вельмі карысны для пошуку інфармацыі аб частках Злучанага Каралеўства (Англія, Шатладыя, Уэльс ды Паўночная Ірландыя). Ён уключае шэраг звестак па гісторыі, геаграфіі, эканоміцы, палітыцы, адукацыі, культуры і спорту. Сайт http://linguistic.ru/ змяшчае арыгінальныя даведкі па страназнаўству і культуралогіі ЗША і Вялікай Брытаніі. Дадзены інфармацыйны рэсурс штодзень абнаўляецца і мае чат для інтэрактыўных зносін.

Што датычыцца пошуку навукова-тэхнічнай інфармаці на англійскай мове, што асабліва актуальна ў тэхнічнай ВНУ, метазгодна засяродзіцца на перыядычных on-line выданнях адпаведна абранай прафесійнай галіны студэнта. Напрыклад “Journal of Engineering & Technology”, “Journal of Information Technology”, "Mendeleev Communications”, “Physics today”, “Architectural Design” і г.д. З гэтай нагоды можна не толькі азнаёміцца з сучаснымі тэхніка-тэхналагічнымі дасягненнямі, аднак і засвоіць шмат новых лексічных адзінак, што безумоўна паспрыяе будучай прафесійнай дзейнасці.

Для засваення і кантролю моўных умельстваў інтэрнэт прапануе шэраг лексіка-граматычных тэстаў. Мы засяродзімся на тых, што больш падыходзяць для самастойнай працы студэнтаў.

Рэсурс http://it-docs.org/tests/ уключае 80 тэстаў. Усе яны падзелены на два тыпы. Першыя дазваляюць выбар аднаго ці нкалькі варыянтаў адказаў з прапанаванага спісу. У такім выпадку адказ азначаны дакладна. Тэсты другога тыпу маюць на ўвазе самастойны пошук адказу, які ўводзіцца ў спецыяльнае поле. Такім чынам навучэнец сам абірае больш спрыяльную для яго методыку засваення.

Рэсурс http://www.homeenglish.ru/ змяшчае тэсты трох узроўней складанасці для вывучэння асноўных граматычных аспектаў.

Тэсты рэсурсу http://englishschool12.ru маюць пяць узроўняў складанасці, што дазваляе студэнту рухацца наперад больш паслядоўна.

Тэсты http :// www . efl . ru могуць разглядацца ў якасці трэнінгу для хуткага засваення англамоўнай лексікі, аднак невялікая база дадзеных абмяжоўвае студэнта ў коле агульнатэхнічнай лексікі. Гэта безумоўна недарэчна для будучага інжынера. Таму для далейшай працы можна параіць рэсурс http://www.exams.ru/ , які змяшчае практыкаванні для асноўных іспытаў па англійскай мове Cambridge ESOL з наяўнасцю тэстаў для людзей з розным узроўнем валодання мовай. Для трэнінгу ўмельства англійскага правапісу падыходзіць рэсурс http://www.sentex.net/~mmcadams/spelling.html .

Што датычыцца тэхналогій, якія прызначаны для спрашчэння працэса засваення іншамоўнай лексікі, то сюды мы аднеслі слоўнікі ды on-line перакладчыкі, галасавыя сінтэзатары для фарміравання правільнага вымаўлення і азнаямлення з акцентамі англійскай мовы, праграмы для канвертацыі тэкста ў транскрыпцыю. З шэрагу on-line слоўнікаў найбольш папулярнымі з’яўляюцца: http://www.lingvo.ru/ − англа-рускі і руска-англійскі

слоўнікі, http://www.wordreference.com/ − англійскі тлумачальны слоўнік, Online dictionaries and encyclopedias − база англа-рускіх, руска-англійскіх і англамоўных тлумачальных слоўнікаў. Да якасных інструментаў для засваення вымаўлення можна аднесці http://www.neospeech.com/, http://www.research.att.com/~ttsweb/tts/demo.php, http://text-to-speech.imtranslator.net/. Усе праграмы дадзенага рэсурсу маюць якасны сінтэзатар маўлення, магчымасць выбраць для агучвання тэксту жанчыну, мужчыну, ці дзіцячы голас.

Значную частку навучання замежнай мове складаюць умельствы пісьмовай мовы. Студэнты павінны ведаць адпаведныя правілы для напісання дзелавых лістоў, справаздач і выступаў. Для фарміравання такога кшталту ўмельстваў існуе рэсурс http://www.english.ru/letter/letter.html. Для дапамогі падчас напісання эсэ можна карыстацца сайтам http://esl.about.com/od/writinglessonplans/a/l_wwshop1.htm . Аднак для карыстання дадзеным рэсурсам неабходна валодаць англійскай мовай на ўзроўні upper- альбо intermediate. Таксама шэраг пісьмовых узораў, схем і дапаможных блокаў ёсць на сайце http://www.esl-galaxy.com/writing.html.

Тым не меньш, асноўная мэта валодання мовай – гэта магчымасць паўсюднай камунікацыі на ёй. З гэтай нагоды сайт http://www.fluent-english.ru/ пабудаваны такім чынам, каб заахвоціць студэнта да маўлення на англійскай мове. Наяўнасць шэрагу разнастайных звестак з інтэтнета, цікавыя практыкаванні з носьбітамі мовы на адпаведных сайтах, магчымасць камунікацыі са студэнтамі замежных ВНУ ёсць адметнай рысай дадзенага рэсурсу. 10 найбольш вядомых пытанняў для ініцыявання гутаркі змяшчае http://esl.about.com/od/speakingbeginner/PronunciationSpeaking_Skills_for_Beginning_Level_English_Learners. Сайты http://iteslj.org/questions і http://www.eslgold.com/speaking/speaking_situations пабудаваны ў адметнай манеры і ўключаюць не толькі клішэ для размовы, тэматычныя ўзоры і артыкулы, але таксама відэаматэрыялы для абмеркавання. Ролевыя гульні можна знайсці на сайце http://www.eslgo.com/resources/sa.html . Яны дазваляюць правядзенне групавых дыскусій на англійскай мове.

Такім чынам, выкладчык мае магчымасць значна скараціць час для пошуку неабходнага і эфектыўнага вучэбнага матэрыялу ў адпаведнасці з тым, якой метадычнай мэты ён імкнецца дасягнуць. З дапамогай інтэрнэт рэсурсаў можна таксама ўводзіць новы лексічны матэрыял падчас аўдыторных заняткаў з тым каб у сваёй самастойнай дзейнасці студэнты імкнуліся да пошуку новых ведаў пры дапамозе разнастайных on-line тэхналогій. Гэта ў сваю чаргу дапаможа студэнту замацаваць умельствы, якія атрыманы падчас практычных заняткаў з выкладчыкам і ўвогуле ўзброіць навучэнцаў стратэгіямі самаразвіцця. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій дае штуршок да развіцця новых формаў і зместаў традыцыйных відаў дзейнасці ў ВНУ і спрыяе павышэнню якасці ведаў і іх практычнай накіраванасці.

Спіс выкарыстаных крыніц:


1. Аксенова Н. В., Шепетовский Д. В. Организация внеаудиторной работы студентов как мотивация к изучению английского языка в техническом ВУЗе // Молодой ученый. — 2014. — №7. — С. 481 – 483.
2. Ардовская, Р.В. Роль содержания обучающей компьютерной программы в профессиональной подготовке студентов вуза // Актуальные проблемы теоретической и прикладной лингвистики: Мат.науч.конф. в 2 ч. Ч.2. – Минск: МГЛУ, 2010. – С. 186 – 190.
3. Гарановіч, Т.І. Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі ў самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў па перакладзе // Язык, перевод и межкультурная коммуникация: вопросы теории и практики преподавания: сб.научных статей. – Минск: РИВШ, 2016. – С. 63 – 69.

4. Макарич, М.В. Роль информационных технологий в процессе иноязычного образования при обучении студентов технических специальностей // Межкультурная коммуникация и перевод: вопросы профессионально ориентированного обучения: сб.научных статей. – Минск: РИВШ, 2014. – С. 142 – 148.